Што такое адзінства?

Бандаровіч Ксенія
ДУА “Грабёнская сярэдняя школа Чэрвеньскага раёна”
7 клас

Адзінства – гэта…

Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы,
Надзейныя сябры і дружбакі.
І госць, і падарожны ў нас
Як дома.
А злым і травы колюцца ў бакі.
Р. Барадулін

Што такое адзінства?

Адзінства – гэта наша квітнеючая Беларусь.

Адзінства – гэта наша дружная сям’я.

Адзінства – гэта нашы сапраўдныя сябры.

Адзінства – гэта мой любімы клас.

Адзінства – гэта мець агульныя інтарэсы.

Адзінства – гэта разумець з паўслова.

Адзінства – гэта аб'яднацца пад адным сцягам.

Адзінства – гэта калі ўлічваюць погляд большасці.

Адзінства – калі народ ведае сваю гісторыю і шануе памяць продкаў.

Адзінства – гэта сувязь паміж сябрамі, людзьмі, пакаленнямі, дзяржавай.

Адзінства – гэта роўнасць.

Адзінства – гэта бяспека, падтрымка ў жыцці, дапамога ў складанай сітуацыі.

Адзінства – гэта важная каштоўнасць беларускага народа.

Мы сябруем, камунікуем, працуем, жывём, усміхаемся, марым разам. Дапамагаем адно аднаму. Пры сустрэчы з аднавяскоўцамі зычым здароўя і шчасця. І таму мы можам быць адзінымі…

Нашы дзяды і прадзеды былі як адно цэлае, таму і перамагалі ў барацьбе з ворагамі. Мы жывём і памятаем пра загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Памятаем пра нашых землякоў, якія пахаваны ў брацкай магіле роднай вёсачкі. Мы ўдзячныя героям ваенных часоў, нашым воінам-землякам.

Мы памятаем пра іх, даглядаем пахаванні, падчас свята прыносім кветкі, праводзім мітынгі. Мы памятаем пра нашых герояў, каб сёння і заўтра жыць пад мірным небам і ў незалежнай краіне.

Мы – будучае маладое пакаленне, якое павінна клапаціцца пра бяспеку нашай незалежнай Рэспублікі Беларусь, пра шчасце і здароўе нашага народа. Мы павінны берагчы прыгажосць роднага краю і клапаціцца пра чысціню свайго роднага кутка.

Свята народнага адзінства, якое адзначаецца штогод 17 верасня, падкрэслівае традыцыі добрасуседства беларускага народа, аб’ядноўвае нас у адну нацыю, робіць больш згуртаванымі, моцнымі.

Мы ўпэўнены: калі будзем разам, то зможам вырашыць любую задачу…